# ПРАДПРЫМАЛЬНІКІ V КЛАСА ІНСТЫТУТА ДЖЭФЕРСАНА ВУЧАЦЦА Ў ГДУ

Напэўна, чытач не адразу зразумее назву гэтага артыкула. Чаму прадпрымальнікі амерыканскага інстытута вучацца ў Гомельскім дзяржуніверсітэце?

Але ўсё па парадку. З 1 па 10 мая група студэнтаў III—V курсаў ГДУ атрымлівала сучасныя веды ў галіне прадпрымальніцкай дзейнасці ў круізна-дзелавым рэйсе на цеплаходзе «Канстанцін Сіманаў». Усяго ў гэтым годзе будзе праведзена 8 такіх рэйсаў па маршруту Масква—Ніжні Ноўгарад — Масква, якія арганізуе Усесаюзны дабрачынны фонд «Інтэлект». Гэты фонд бясплатна прымаў студэнтаў з г. Гомеля, клапоцячыся аб іх будучым у рыначнай эканоміцы. Астатнія ж удзельнікі дзелавога рэйсу з'яўляюцца кіраўнікамі буйных прадпрыемстваў, арганізацый, кааператываў, банкаў, навучальных устаноў краіны. На кожны круіз запрашаецца 60 амерыканскіх бізнесменаў і 120 удзельнікаў, якія прадстаўляюць савецкія дзелавыя колы, зацікаўленыя ў развіцці сумеснага бізнесу ва ўмовах свабоднага рынку. На нашым туры прысутнічалі толькі два амерыканцы, астатнія паслухаліся свайго прэзідэнта і не сталі рызыкаваць, адмовіліся ад паездкі, пакуль не скончыцца блізкаўсходні крызіс. Аднак узровень абслугоўвання пры такім збегу акалічнасцей не знізіўся, і ўсіх нас прымалі як замежных бізнесменаў. Арганізацыя, абслугоўванне, харчаванне, экскурсіі — на вышэйшым узроўні. Былі толькі прэтэнзіі да савецкіх артыстаў, якія выступалі з улікам не прыехаўшых замежных гледачоў. Астатняе, па нашаму аднадушнаму анкетнаму апытанню, было праведзена на «выдатна», дзе з плюсам, а дзе з мінусам. Дарэчы, усіх жадаючых, у тым ліку і студэнтаў, якія былі на роўных з усімі акадэмікамі і банкірамі, выслухалі і нават асобныя выступленні прагучалі па радыё на караблі. Наогул, студэнтам з Гомеля ўдзялялася асаблівая ўвага як будучыні вялікага савецкага рынку. Многіх з іх ведалі па імёнах і захапленнях.

Усім спадабалася, з якой цікавасцю вучацца студэнты ГДУ. Як імкнуцца трапіць не толькі ў Школу бізнесу Інстытута Джэферсана і пасяджэнні круглых сталоў, што адымала 8—10 гадзін у дзень, але і паспяваюць на дзелавую гульню «Стратэгія кіравання», відэатрэнінг дзелавых і міжасабовых зносін, заняткі англійскай мовай, а потым, што зацікавіла, яшчэ перапісваюць у свае сшыткі.

Безумоўна, больш за ўсё мы любілі наведваць заняткі школы бізнесу і палюбілі яго выкладчыка Дэвіда Ціпета, а таксама і нашага перакладчыка, які дапамагаў нам зразумець усе тонкасці прадпрымальніцтва на сучасным рынку. Дарэчы, часам мы сварыліся на занятках з-за магчымасцей нашага рынку і развітога, а ўмовы навучання патрабавалі нам выходзіць на сусветны рынак з выдатным таварам, выдатнай асабістай рэпутацыяй і рэпутацыяй нашых банкаў. У выніку навучання ўсё прыцерлася, руская эмацыянальнасць увайшла ў межы сусветных стандартаў дзесьці на трэціх занятках. Больш за ўсё многіх здзівіла садружнасць рускага прыбора «Лектар», які часта не выкарыстоўваецца на нашых кафедрах, і персанальнага камп'ютэра педагога. «Лектар» у кіназале замяняў звычайную дошку, на якой узнікалі графікі і методыкі аналізу выбранага напрамку бізнесу. Бізнес, як сапраўдную справу, мару прапаноўвалі заўсёды студэнты. Толькі ў аналіз педагог дапускаў прадпрымальнікаў з іх вопытам савецкага рынку, каб лепш зразумець нашы ўмовы гаспадарання. Напрыклад, Віктар Савасцьянаў спрабаваў дапамагаць Дэвіду прадаць новыя італьянскія штаны высокага кошту і працягласцю носкі ў 9 гадоў, а астатнія тым часам маглі засвоіць усе прынцыпы і прыёмы, як утрымаць кліента на сваім рынку. Тут усе зразумелі, што аб сваёй прадукцыі і сваім кліенце трэба ведаць усё! Пасля заняткаў усе атрымалі заданне на заўтра. Кожны слухач павінен быў прапанаваць прадукт на рынак з тлумачэннем усіх яго пераваг, падабраць факты, з дапамогай якіх можна было пераканаць купіць гэты тавар свайго пастаяннага кліента і даць рэкламу.

Адведзены час не прайшоў дарэмна. Нават у бары, дзе студэнты маглі папіць пепсі, закусіць цукеркай, выпіць шклянку кавы і паглядзець новую праграму групы «Самацветы», ішла ажыўленая размова пра бізнес на заўтра, на раніцу, калі Дэвід можа спытаць любога. А раніцай наш дамарослы студэнт III курса Сяргей Гаравенка рэкламаваў рускую лазню як месца правядзення свабоднага часу, дзе можна расслабіцца, памыцца, закусіць, прыняць лячэбны масаж, купіць навінкі расійскіх промыслаў як на рублі, так і на валюту. Праўда, спачатку лектар-бізнесмен не зразумеў, чаму ў нас так шмат нямытых, якія павінны сабрацца не дзе-небудзь, а ў лазні. Але потым, стаўшы ў душы рускім, засвоіўшы нашы традыцыі і ўлічваючы настальгію выхадцаў з Расіі ў ЗША, прызнаў прадукт, бізнес Сяргея, магчымасць яго распаўсюджання ў штаце Айова. Наша каманда была задаволена. Праўда, была зроблена заўвага, але гэта з боку нашых прадпрымальнікаў, як бы чаго ў лазні не здарылася недазволенага. Але на віду, пад прыглядам дзяўчат у рускіх сарафанах і паліcмена, у штатах бізнес Сяргея павінен быць на ўзроўні бяспекі. Ёсць такое патрабаванне да бізнесу.

Усеагульны любімец публікі, якая не здраджвала Школе бізнесу, Рафаэль з Ленінграда, які прадаваў або купляў спартыўныя аўтамабілі, дапамагаў дасканальваць некалькі рэкламных прапаноў. З гэтай серыі трэба нагадаць зубную пасту Аляксандра Сафоненкі, на якую канчатковая рэклама гучала так: «Наша паста — Ваша галівудская ўсмешка». Замкі другога бізнесмена са студэнцкага асяроддзя прайшлі пад дэвізам: «Двайная пастка». Рускія лапці, якія Дэвід бачыў у Суздалі, прайшлі з такімі рэкламамі: «Крок за крокам — сотні год», «Чым мы горш за нашых продкаў», «Жадаеш быць рускім — пабудзь у лапцях!», «Калі Вы пройдзеце па Нью-Йорку ў лапцях — дзяўчаты будуць Вашы!», «Вам не хапае толькі лапцяў!».

Адным з прынцыпаў бізнесу, як мы засвоілі цяпер намёртва, з'яўляецца лозунг: «Не абяцай таго, чаго не зможаш гарантаваць!». Адно можна сказаць, што ў школе бізнесу мы вучыліся весела, з карысцю, раўнапраўна. Нас ніхто не абразіў, калі з першага разу мы не да тонкасцей разумелі заданне, прынцыпы методыкі. Нам, папраўляючы далікатна, дазвалялі выбраць больш правільны шлях у бізнесе! Без перабольшвання скажу, што на апошніх занятках усе былі крануты да слёз. Некаторыя не хавалі іх, іншыя тэрмінова беглі пакурыць, а сам Дэвід плакаў і не саромеўся. І ў гэтым напрамку ён многаму нас навучыў усяго за дзевяць заняткаў. Любіць чалавека, ставіць яго ў цэнтр ўсяго жыцця, праяўляць цікавасць для кожнага, пакідаць ад зносін добрыя ўспаміны, у штодзённых клопатах не забываць сям'і, дзяцей, жонкі і часцей глядзець на сябе іх вачыма. Таму ў штотыднёвіку цывілізаванага прадпрымальніка, а мы спадзяемся імі стаць, павінен быць час, час для выканання абяцанняў дзецям, кветкі і цукеркі жонцы, увогуле ўсялякія дробязі, якія ўздымаюць нам настрой. Таму што бізнес — цяжкая справа, яму трэба аддавацца сур'ёзна, мы рызыкуем страціць сродкі для існавання, свае імя сярод людзей, але сям'я — гэта першае дзеля чаго жыве і ўдасканальваецца чалавек!

Такім чынам, мы, студэнты эканамічнага і фізічнага факультэтаў ГДУ, усяго 21 чалавек, сталі прадпрымальнікамі V класа сумеснага вучэбнага цэнтра па малому і сярэдняму бізнесу фонду «Інтэлект» і Інстытута Джэферсана ЗША.

Таксама дыпломы ў нашай краіне атрымалі больш за 600 савецкіх і замежных прадстаўнікоў дзелавога свету. Рабочыя мовы: руская і англійская. Сярод нас былі людзі з усіх канцоў краіны. Усе засталіся задаволены. Жадаючыя хутка скарэктыраваць свае веды, атрымаць новыя, пішыце па адрасу: 112115, г. Масква, вул. Студэнцкая, д. 42, памяшканне 107. Усесаюзны дабрачынны фонд «Інтэлект». Тэлефоны: 249-92-94, 240-96-22.

**Э. ЛІЗАРАВА,**
**ст. н. с. кафедры эканомікі і сацыялогіі працы.**

*У прафкоме*

# Па хвалюючых пытаннях

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

кі спецыяльнага палажэння па гэтых надбаўках. Будзе павышана заработная плата і астатнім катэгорыям работнікаў — да 30—40%.

Што датычыць не менш балючага пытання, якое хвалюе ўсіх нас, пражываючых у зоне з радыеактыўным забруджваннем 1—5 Кі/км. кв., летняга аздараўлення, то, як паведаміла галоўны бухгалтар, на гэтыя мэты універсітэтам выдзелена 60 тыс. рублёў. Тым выкладчыкам і супрацоўнікам, хто не зможа атрымаць санаторныя, турысцкія пуцёўкі, будзе выплачана грашовая кампенсацыя. На гэта будзе затрачана 170 тыс. руб. — сэканомленых сродкаў па заработнай плаце за 1990 год. Калі работнік універсітэта набывае пуцёўку коштам да 250 руб., то ён плаціць за яе 30%, калі яе кошт у межах 250—500 руб. — 50%, за пуцёўку коштам звыш 500 руб. універсітэт выплачвае 250 руб, за дзіцячыя пуцёўкі работнікі ГДУ плацяць 30% іх кошту.

На пасяджэнне прафкома былі запрошаны нам. старшыні абкома прафсаюза работнікаў народнай адукацыі і навукі Н. І. Аліфірэнка і галоўны бухгалтар Г. І. Шорахава. Да іх у старшыні прафкома Г. І. Варатніцкага і членаў прафкома было нямала пытанняў: у прыватнасці, чаму сёлета універсітэт не атрымаў на летні перыяд санаторна-курортных пуцёвак, а толькі турыстычныя (а ў калектыве ГДУ нямала людзей, якія адчуваюць вострую патрэбу ў санаторна-курортным лячэнні); чаму работнікі універсітэта не могуць атрымліваць грашовыя датацыі на харчаванне, як гэта робіцца на прамысловых прадпрыемствах; чаму мы не маем магчымасці зрабіць турыстычныя паездкі на некалькі дзён за мяжу, напрыклад, у Польшчу, і г. д. Справядлівым было выказванне і аб тым, што галіновы прафсаюз мае слабыя кантакты з прафкомам нашай ВНУ. На зададзеныя пытанні былі атрыманы адказы, але не ўсе іх задаволілі членаў прафкома.

Старшыня жыллёвай камісіі прафсаюзнага камітэта П. Д. Грыгарук выступіў з інфармацыяй аб рабоце ўзначальваемай ім камісіі: аб упарадкаванні спісаў прафесарска-выкладчыцкага саставу, работнікаў універсітэта на атрыманне дзяржаўных кватэр і ў ЖБК, аб ухіленні недахопаў у афармленні дакументацыі па жыллёваму пытанню, выяўленых камісіяй Цэнтральнага райвыканкома. Аднак у сувязі з недастатковай падрыхтаванасцю пытання аб рабоце жыллёвай камісіі П. Д. Грыгаруком дэталёвае яго абмеркаванне перанесена на чарговае пасяджэнне прафкома.

На пасяджэнні прафкома разгледжана таксама пытанне аб звальненні з работы за прагулы вадзіцеляў П. Р. Краўцова і А. У. Казакова.

Зацверджаны спісы дзяцей работнікаў ГДУ, якія ад'язджаюць у чэрвені на аздараўленне ў піянерскі лагер «Цэсіс», размеркаваны турыстычныя пуцёўкі.

**Т. ДУБЯК,**
**член рэвізійнай камісіі прафкома, прафесар.**

*СССР глазами зарубежных студентов*

# ЛЕНИНГРАД

**Иностранные студенты, которые обучаются в нашем университете, совершают много экскурсий по историческим, памятным местам нашей республики, страны. Итогом этих поездок становятся не только неизгладимые впечатления иностранных гостей от увиденного во время этих путешествий, но и сочинения, которые они пишут на русском языке о том, что понравилось, поразило воображение.**

**Одно из них мы предлагаем вниманию читателей.**

ЛЕНИНГРАД — известный город в мире. В Конго я уже слышал об этом замечательном городе и всегда мечтал посмотреть его. Когда наш преподаватель предложила поехать туда на экскурсию, не задумываясь, я сразу согласился.

И вот в конце апреля с Гомельского вокзала вместе с двумя преподавателями студенты ГГУ отправились в Ленинград. Наша группа состояла из студентов из Вьетнама Индии, Конго, Анголы, Эфиопии, Никарагуа и др. Путь был длинным. Мы приехали в Ленинград днем, после почти 24-х часов езды.

Несмотря на усталость, мы все хотели быстрее начать знакомство с городом. Любовались мы им уже прямо из окон автобуса. Я был рад видеть красоту Ленинграда. Река Нева и мосты еще больше украшают его. Мне очень понравилась древняя архитектура города.

В Ленинграде мы жили в гостинице «Спутник», которая находится недалеко от центра. Бывший город Петра I имеет больше 4-х миллионов жителей. Он очень большой и имеет огромное богатство. Мы посетили Павловский дворец — архитектурно-парковый ансамбль конца XVIII — начала XIX веков. Датой основания Павловска считается 1777 год. Екатерина II подарила своему сыну Великому князю Павлу Петровичу и его супруге Марии Федоровне лесную живописную местность. За 50 лет здесь был построен дворец и создан прекрасный парк.

В Ленинграде мы осмотрели кладбище, где погребены самые известные русские люди. А еще мы были очень рады посетить один из известнейших музеев мира — Эрмитаж, Русский музей, Исакиевский собор и другие достопримечательности. Мы не можем представить себе Ленинград без Невского проспекта. Он известен также, как и проспект Калинина в Москве. На Невском проспекте можно видеть много людей. Его стиль: древние красивые здания, а на первом этаже современные магазины.

Я считаю, что Ленинград — один из красивейших городов мира.

**ОКАНЗА РЕНЕ СТЕФАН,**
**(Конго), гр. Р-12.**

# ПЕРШЫ ВЫПУСК

На біялагічным факультэце адбыўся першы выпуск слухачоў школы «Юны біёлаг». Два гады таму назад у газеце «Гомельская праўда» была аб'ява аб адкрыцці школы «Юны біёлаг» на біяфаку ГДУ. Слухачамі гэтай школы могуць быць навучэнцы 8-9 класаў сярэдніх школ г. Гомеля. Тэрмін заняткаў — 2 гады. Вучэбная праграма школы ўключае тэарэтычны курс — 60 гадзін і практычныя заняткі — 38 гадзін.

У рабоце школы ўдзельнічалі ўсе чатыры кафедры факультэта. Пытанні, ўключаныя ў праграму, былі больш складанымі, чым гэта прадугледжана праграмай агульнаадукацыйнай школы. Большая частка пытанняў была ўключана з праграм абласной і рэспубліканскай біялагічнай алімпіяд школьнікаў апошніх гадоў. Заняткі праводзіліся вопытнымі выкладчыкамі факультэта / прафесарамі, дацэнтамі адзін раз у тыдзень па 2 гадзіны. Час правядзення заняткаў узгоднены з бацькамі і навучэнцамі. Зрыву заняткаў за ўвесь тэрмін навучання не было. Выніковыя заняткі і экзамен для навучэнцаў праводзіліся з выкарыстаннем вучэбнага тэлебачання. Найбольш змястоўнымі былі адказы вучняў з СШ № 31: О. Пакінька, О. Еўтухова, О. Данчанка з СШ № 11 і інш.

16 мая дэкан факультэта дацэнт В. Я. Верамейчык ва ўрачыстай абстаноўцы уручыў вучням пасведчанні аб заканчэнні школы «Юны біёлаг». Большасць слухачоў гэтай школы сёлета будзе паступаць на біялагічны факультэт нашага універсітэта. Гэта будзе дастойнае папаўненне біяфака.

**А. КАЛУГІН,**
**пазаштатны дырэктар на грамадскіх пачатках школы «Юны біёлаг».**

